Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
______________В. М. Міхееў
«____»_____________2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____ /вуч.

# НАВУКОВА-ЭКСПАЗІЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МУЗЕЯ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для напрамку спецыяльнасці*
*1-23 01 12-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (музеязнаўства) і напрамку спецыяльнасці*
*1-23 01 12-04 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2013

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. М. Нароўская,* дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*М. М. Елінская,* кансультант аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук;
*А. А. Гулак,* старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 26. 04. 2013 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 20.06. 2013 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. М. Нароўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Музейная экспазіцыя з’яўляецца сінтэзам навукі і мастацтва і ажыццяўляецца з дапамогай архітэктурна-мастацкіх сродкаў. Музейны прадмет, які трапіў у экспазіцыю, уступае ва ўзаемадзеянне з іншымі музейнымі прадметамі і становіцца экспанатам. Сукупнасць экспанатаў, аб’яднаных адной навуковай праблемай і адпаведна гэтаму размешчаных у часе і прасторы, утварае экспазіцыйны комплекс альбо раздзел экспазіцыі.

*Мэта* вывучэння дысцыпліны – азнаямленне з тэорыяй і практыкай навукова-экспазіцыйнай дзейнасці музеяў, фарміраванне ведаў і практычных навыкаў, неабходных для распрацоўкі навуковай канцэпцыі, архітэктурна-мастацкага рашэння і арганізацыі музейных экспазіцый і выстаў.

У адпаведнасці з мэтай вызначаны наступныя *задачы*:

– азнаямленне студэнтаў з асноўнымі палажэннямі тэорыі праектнай дзейнасці музеяў;

– фарміраванне дакладнага ўяўлення аб методыцы арганізацыі музейных экспазіцый і выстаў;

– асэнсаванне прафесійных навыкаў экспазіцыянера.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– сутнасць і спецыфіку музейных экспазіцый і выстаў;

– асноўныя прынцыпы і метады пабудовы экспазіцый;

– формы экспанавання і сувязі экспаната з прасторавым асяроддзем;

– асаблівасці экспазіцый музеяў living рознага профілю;

– асноўныя прынцыпы архітэктурна-мастацкага праектавання музейных экспазіцый;

– праблемы праектавання музейных экспазіцый.

Студэнты павінны *ўмець:*

– выкарыстоўваць асноўныя паняцці, тэрміны, фактычны матэрыял і атрыманыя навыкі ў музейнай дзейнасці;

– вызначаць крытэрыі для адбору музейных прадметаў у экспазіцыю;

– ствараць тэматыка-экспазіцыйны план і разгорнутую тэматычную структуру экспазіцыі;

– афармляць уліковую дакументацыю пры перадачы музейных прадметаў на экспазіцыю;

– праводзіць ахоўныя мерапрыемствы па ўтрыманні ў належным стане музейных экспанатаў у экспазіцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграма дысцыпліны «Навукова-экспазіцыйная дзейнасць музеяў» распрацавана з улікам пастаўленых задач і ўзгоднена з праграмамі іншых курсаў, якія выкладаюцца на кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства («Тэорыя і методыка музейнай справы», «Менеджмент музейнай справы» і інш.).

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія мэтазгодна выкарыстоўваць пры выкладанні дысцыпліны, адносяцца:

– гісторыка-тэматычны падыход;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– камунікатыўныя тэхналогіі;
– праектныя тэхналогіі;
– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, разнастайныя варыянты самастойнай работы пад кіраўніцтвам выкладчыка, вучэбна-метадычныя комплексы. Для правядзення семінарскіх заняткаў варта выкарыстоўваць методыкі актыўнага навучання, метад малых груп, праектную дзейнасць, дыскусійныя формы.

На вывучэнне дысцыпліны вучэбным планам прадугледжана 136 гадзін, з іх 66 – аўдыторных (лекцыі – 42 гадзіны, семінары – 24 гадзіны).

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінар. заняткі |
| Уводзіны | 2 | 2 | |
| **Раздзел I. Асноўныя прынцыпы, метады і структура эскпазіцый** | | | |
| ***Тэма 1.*** Прынцыпы і метады пабудовы музейных экспазіцый і выстаў | 2 | 2 | |
| ***Тэма 2.*** Тэматычная структура экспазіцый музеяў | 2 | 2 | |
| ***Тэма 3.*** Экспазіцыйныя і навукова-дапаможныя матэрыялы ў экспазіцыі | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 4.*** Этыкетаж і тэксты ў музейнай экспазіцыі | 2 | 2 | |
| **Раздзел II. Навуковае праектаванне музейных экспазіцый і выстаў** | | | |
| ***Тэма 5.*** Навуковае праектаванне экспазіцый | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 6.*** Разгорнутая тэматычная структура экспазіцый (РТС) | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 7.*** Тэматыка-экспазіцыйны план экспазіцый (ТЭП) | 4 | 2 | 2 |
| **Раздзел III. Асаблівасці экспазіцый музеяў розных профіляў і тыпаў** | | | |
| ***Тэма 8.*** Асаблівасці экспазіцый гістарычных музеяў | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 9.*** Тэндэнцыі ў праектаванні экспазіцый мастацкіх музеяў | 6 | 4 | 2 |
| ***Тэма 10.*** Экспазіцыі музеяў пад адкрытым небам і іх асаблівасці. Экспазіцыі музеяў-запаведнікаў | 6 | 4 | 2 |
| ***Тэма 11.*** Экспазіцыі літаратурных музеяў. Прыёмы дэманстрацыі кніг у музейных экспазіцыях | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 12.*** Формы экспанавання і сувязь экспаната з прасторавым асяроддзем | 2 | 2 | |
| **Раздзел IV. Асноўныя прынцыпы мастацкага праектавання музейных экспазіцый** | | | |
| ***Тэма 13.*** Асаблівасці мастацкага праектавання музейных экспазіцый | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 14.*** Колер і свет у экспазіцыі | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 15.*** Абсталяванне ў сістэме экспазіцыйнага ансамбля | 4 | 2 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Раздзел V. Арганізацыя і асноўныя этапы мастацкага праектавання музейных экспазіцый** | | | |
| ***Тэма 16.*** Генеральнае рашэнне музейнай экспазіцыі | 2 | 2 | |
| ***Тэма 17.*** Эскізны праект музейнай экспазіцыі | 2 | 2 | |
| ***Тэма 18.*** Тэхнарабочае праектаванне. Арганізацыя мантажу экспазіцыі | 4 | 2 | 2 |
| Разам ... | 66 | 42 | 24 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## *Уводзіны*

Музейная экспазіцыя як асноўная форма музейнай камунікацыі. Паняцці «музейны прадмет», «музейны экспанат», «музейная калекцыя» і «музейны збор». Экспазіцыйны комплекс як раздзел экспазіцыі. Тэма экспазіцыі. Асноўныя кірункі і змест экспазіцыйнай работы. Асноўная задача музейных экспазіцый і выстаў. Асаблівасці музейных экспазіцый. Культурна-адукацыйныя мэты экспазіцыі.

Стацыянарныя і перасоўныя выставы. Выставы фондаў. Выставы новых паступленняў. Дэманстрацыя рэстаўрацыйных работ. Справаздачы палявых экспедыцый.

Куратарскі праект. Арганізацыя выстаў як асноўная форма рэалізацыі медыяпраектаў. Асноўныя адрозненні музейнага праекта ад куратарскага. Арганізацыя транснацыянальных і інтэрактыўных праектаў.

## Раздзел I. Асноўныя прынцыпы, метады і структура эскпазіцый

### *Тэма 1. Прынцыпы і метады пабудовы музейных экспазіцый і выстаў*

Паняцце прынцыпу ў музейнай экспазіцыі. Прынцып прадметнасці. Прынцып ідэйнасці. Прынцып гістарызму. Прынцып масавай камунікацыі ў экспазіцыі. Прынцып нагляднасці. Прынцыпы ўніверсальнасці. Адзінства прынцыпаў экспазіцыі. Сінтэз навуковай і мастацкай канцэпцыі.

Метады пабудовы музейных экспазіцый. Дэманстрацыя «рарытэтаў і кур'ёзаў» экспазіцый кунсткамер. Сістэматычныя экспазіцыі. Аснова сістэматызацыі аддзелаў старажытнай археалогіі. Калекцыйны паказ прадметаў матэрыяльнай культуры. Сістэматызацыя па геаграфічнай прыкмеце. Тыпалагічны рад. Ансамблевы метад паказу экспазіцыі. Комплексна-тэматычны метад. Тэматычна-экспазіцыйныя комплексы. Вобразна-сюжэтны метад рускага даследчыка Т. П. Палякова. Сюжэтная пабудова экспазіцыі. Структурныя элементы экспазіцыі – завязка, кульмінацыя і развязка. Экспазіцыйныя жанравыя формы: экспазіцыйны нарыс; экспазіцыйнае даследаванне; экспазіцыйная мадэль часу і свету.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 2. Тэматычная структура экспазіцый музеяў*

Тэматычная структура экспазіцыі і яе задачы. Прынцып гістарызму ў структуры экспазіцыі. Храналагічны прынцып пабудовы паказу асобных этапаў экспазіцыі. Праблемны падыход пры фарміраванні тэматычнай структуры. Тэмы і падтэмы ў экспазіцыі. Экспазіцыйныя комплексы. Комплексы-ансамблі. Мемарыяльныя і рэканструяваныя комплексы-ансамблі. Калекцыйныя комплексы. Экспазіцыйны зал і яго роля ў стварэнні экспазіцый.

### *Тэма 3. Экспазіцыйныя і навукова-дапаможныя матэрыялы ў экспазіцыі*

Асноўныя віды экспазіцыйных матэрыялаў. Музейныя прадметы. Інфарматыўнасць, атрактыўнасць і экспрэсіўнасць музейных прадметаў. Прадметы мемарыяльнага значэння. Прыёмы паказу мемарыяльных музейных прадметаў у экспазіцыі.

Выяўленчыя матэрыялы. Крытэрыі адбору выяўленчых матэрыялаў і іх эмацыянальны ўплыў на наведвальнікаў. Рэтраспектыўныя выявы (гістарычны жывапіс, графіка, скульптура). Дыярама і яе месца ў сістэме выяўленчых сродкаў. Фотаздымкі ў экспазіцыі. Крытэрыі адбору фотаздымкаў з фондасховішчаў і архіваў. Мемарыяльныя фотаздымкі і іх роля ў экспазіцыі. Дакументальныя кінастужкі, тэлефільмы, дыяпазітывы, CD-ROM.

Пісьмовыя крыніцы. Дакументальныя фонаматэрыялы. Унікальныя запісы выступленняў, магнітафонныя і дыктафонныя запісы, выкарыстанне запісаў шумоў і інш. Копіі музейных прадметаў. Макеты і мадэлі пазамузейных аб’ектаў. Навуковыя рэканструкцыі. Галаграма ў музейнай экспазіцыі.

Экспазіцыйныя навукова-дапаможныя матэрыялы. Карты. Схемы. Планы і чарцяжы. Дыяграмы.

### *Тэма 4. Этыкетаж і тэксты ў музейнай экспазіцыі*

Сістэма тэкстаў у экспазіцыі. Вядучыя тэксты і сувязь іх з навуковай канцэпцыяй. Загалоўныя тэксты і роля іх у вызначэнні маршруту агляду экспазіцыі. Тлумачальныя тэксты. Этыкетаж і яго роля ў атрыманні інфармацыі аб экспанатах. Кампазіцыі этыкетак. План экспазіцыйных залаў. Указальнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Навуковае праектаванне музейных экспазіцый і выстаў

### *Тэма 5. Навуковае праектаванне экспазіцый*

Арганізацыя работы над экспазіцыяй. Навуковая канцэпцыя экспазіцыі. Мастацкае і тэхнарабочае праектаванне як стадыі праектавання экспазіцыі. Абгрунтаванне тэматычнай структуры. Метады паказу (уключэнне ў сістэму тэматыка-экспазіцыйных комплексаў, ансамбляў-інтэр’ераў, калекцыйных груп). Вызначэнне вядучых экспанатаў (ці комплексаў), экспанатаў павышанай атрактыўнасці. Размяшчэнне экспанатаў на прымузейнай тэрыторыі.

### *Тэма 6. Разгорнутая тэматычная структура экспазіцый (РТС)*

Стварэнне разгорнутай тэматычнай структуры экспазіцыі. Раскрыццё ідэйнага зместу кожнай экспазіцыйнай тэмы. Уключэнне вядучых тэкстаў. Характарыстыка музейных прадметаў, адабраных для экспазіцыі. Камплектаванне музейных прадметаў па тыпах. Метады работы. Стварэнне картатэкі з асноўнымі параметрамі музейных прадметаў.

Фарміраванне тэматыка-экспазіцыйных комплексаў у межах экспазіцыйных тэм і падтэм. Стварэнне накіду-чарцяжа ці аплікацыі. Папярэдняя фіксацыя экспанатаў у музейнай экспазіцыі.

### *Тэма 7. Тэматыка-экспазіцыйны план экспазіцый (ТЭП)*

Тэматыка-экспазіцыйны план як выніковы дакумент навуковага праектавання экспазіцыі. Навуковае абгрунтаванне экспазіцыі. Прынцыпы экспазіцыйных рашэнняў. Першыя праектныя дакументы і выкарыстанне іх у тэматыка-экспазіцыйных планах. Вызначэнне канчатковай тэматычнай структуры. Вызначэнне канчатковай назвы раздзелаў і тэм. Скразная нумарацыя комплексаў. Звесткі аб характары экспазіцыйных матэрыялаў (арыгіналы, копіі, навуковая рэканструкцыя). Вядучыя тэксты. Кампазіцыйныя і афарміцельскія рашэнні экспазіцыі. Роля тэматыка-экспазіцыйнага плана ў стварэнні музейных экспазіцый і выстаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Асаблівасці экспазіцый музеяў розных профіляў і тыпаў

### *Тэма 8. Асаблівасці экспазіцый гістарычных музеяў*

Асноўныя профільныя групы музеяў. Тыпалагічнае дзяленне музеяў па іх асноўным грамадскім прызначэнні і асаблівасці экспазіцый навукова-даследчых (культурна-адукацыйных), даследчых (акадэмічных) і вучэбных музеяў. Прызначэнне і характар экспазіцый навукова-даследчых, акадэмічных і вучэбных музеяў.

Гістарычныя музеі і задачы экспазіцый музеяў гістарычнага профілю. Агульная тэарэтычная аснова для стварэння экспазіцый гістарычных музеяў. Адрозненні навуковых канцэпцый, тэматычных структур, праблем, складу матэрыялаў і характару комплексаў розных відаў гістарычных музеяў.

Экспазіцыі па старажытнай гісторыі. Традыцыйныя метады паказу археалагічных прадметаў. Праблемы праектавання музейных археалагічных экспазіцый. Навуковыя рэканструкцыі. Рэстаўрацыя, кансервацыя і арганізацыя музейнай экспазіцыі: археалагічны комплекс «Бярэсце», археалагічныя комплексы ў Лэзэйзі і Ласка ў Францыі, Вертэшселеш у Венгрыі, Крэмль Градчан у Празе і інш.). Музеефікацыя археалагічных комплексаў у рэспубліках СНД (Херсанес, Панцікапей, Танаіс і інш.) і ў Расіі (у Пскове, Ніжні Ноўгарад, Уладзімірска-Суздальскі запаведнік і інш.).

Экспазіцыі феадальнага перыяду. «Метады рэліктаў». Пісьмовыя крыніцы і выяўленчыя матэрыялы. Экспазіцыі перыяду капіталізму. Экспазіцыя па гісторыі дарэвалюцыйнага часу і яе перыядызацыя. Этнаграфічныя калекцыі. Рэканструкцыя побытавага абсталявання (хатні альбо вытворчы інтэр’ер). Пісьмовыя крыніцы. Гістарычны жывапіс. Выкарыстанне матэрыялаў па сучасным перыядзе.

### *Тэма 9. Тэндэнцыі ў праектаванні экспазіцый мастацкіх музеяў*

Тэндэнцыі ў экспазіцыях мастацкіх музеяў Еўропы і ЗША ў XX – пачатку XXI ст. Тэарэтыкі кірунку экспазіцый «экспанат у фокусе» Альфрэд Бар, Аляксандр Эліот. Асаблівасці экспазіцый «праблемная групіроўка», «белы куб».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўная мэта і задачы экспазіцый мастацкіх музеяў. Экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і яго філіялаў. Музей беларускага народнага мастацтва ў в. Раўбічы Мінскага р-на (1977), Дом-музей Ваньковічаў. Культура і мастацтва першай паловы XIX ст. (1984), Музей В. К. Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве (1978). Музей-майстэрня З. І. Азгура ў Мінску (1996).

Асаблівасці экспазіцый Музея сучаснага мастацтва. Экспазіцыі галерэй сучаснага мастацтва. Мастацкая галерэя «Універсітэт культуры». Галерэя «Канцэпцыя». Асаблівасці экспазіцый галерэі «Ласандра» і інш.

Тэндэнцыі экспазіцый мастацкіх музеяў канца XX–пачатку XXI ст.

### *Тэма 10. Экспазіцыі музеяў пад адкрытым небам і іх асаблівасці. Экспазіцыі музеяў-запаведнікаў*

Беларускі музей народнай архітэктуры і побыту як першы беларускі музей-скансэн. Арганізацыя навуковых экспедыцый у канцы 1970–пачатку 1990-х гг. па зборы помнікаў архітэктуры і этнаграфіі. Распрацоўка навуковых канцэпцый, тэматычных структур і тэматыка-экспазіцыйных планаў экспазіцый музея. Адкрыццё экспазіцыі (1979). Этнаграфічныя экспазіцыі і тэматычныя выставы сельскагаспадарчых прылад працы, прадметаў побыту. Выставы адкрытых фондаў Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (БДМНАП).

Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» (1993). Экспазіцыі музея-запаведніка «Нясвіж».

Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе» (1997). Асноўныя экспазіцыі музейна-выставачнага комплексу. Экспазіцыі музеяў «Млын», «Кузня», «Хата завозніка», «Свіран». Асаблівасці экспазіцыі ў Дудутках.

### *Тэма 11. Экспазіцыі літаратурных музеяў. Прыёмы дэманстрацыі кніг у музейных экспазіцыях*

Асаблівасці экспазіцыі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы (1976). Сучасная экспазіцыя музея. Асаблівасці экспазіцыі Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа (1959). Сучасная экспазіцыя музея і яго філіялаў.

Экспазіцыі Літаратурнага музея Петруся Броўкі (1984). Мемарыяльныя рэчы ў экспазіцыі. Сучасная экспазіцыя музея і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яго філіялаў: Хата-музей Петруся Броўкі ў в. Пуцілкавічы Ушацкага р-на Віцебскай вобл. (1980).

Адкрыццё экспазіцыі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча (1991). Пабудова экспазіцыйных раздзелаў музея ў адпаведнасці з назвамі цыклаў зборніка «Вянок». Экспазіцыі філіялаў «Беларуская хатка» ў г. Мінску (1986), фальварак Ракуцёўшчына ў Маладзечанскім р-не Мінскай вобл. (1991).

Прыёмы дэманстрацыі кніг у музейнай экспазіцыі. Прыём параўнання і кантраснага паказу. Прыём камбінаванага паказу. Спецыфіка дэманстрацыі кнігі як музейнага экспаната. Рэчавыя і выяўленчыя крыніцы ў кніжнай экспазіцыі.

### *Тэма 12. Формы экспанавання і сувязь экспаната з прасторавым асяроддзем*

Вызначэнне асноўнага крытэрыю сувязі экспаната з першасным асяроддзем. Асноўныя тыпы экспазіцый. Аўтэнтычны тып экспазіцый і яго варыянты. Аўтэнтычнае асяроддзе і інтэр’ер. Музейныя экспанаты ў першасным асяроддзі, «in situ».

Дакументаваны тып экспазіцыі і яго варыянты. Выкарыстанне разнастайных метадаў. Візуальныя сродкі і сувязь з першасным асяроддзем. Арыгінальныя і дапаможныя матэрыялы.

Недакументаваны тып экспазіцыі і яго варыянты. Адсутнасць сувязі паміж экспанатамі і першасным асяроддзем. Характэрныя рысы экспазіцыі.

## Раздзел IV. Асноўныя прынцыпы мастацкага праектавання музейных экспазіцый

### *Тэма 13. Асаблівасці мастацкага праектавання музейных экспазіцый*

Паняцце «архітэктурна-мастацкае рашэнне экспазіцыі». Асноўная мэта і задачы мастацкага праектавання. Прынцып адзінства зместу і формы экспазіцыі. Важнейшыя патрабаванні і крытэрыі ацэнкі архітэктурна-мастацкага праекта экспазіцыі. Асаблівасці мастацкага праектавання музейнай экспазіцыі.

Мастацкая структура экспазіцыі. Візуальна-вобразнае рашэнне экспазіцыі. Кампазіцыйная пабудова экспазіцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 14. Колер і свет у экспазіцыі*

Тэорыя «дынамічнага альбо фіксуючага колеру» Ф. Бірэна 30–40-х гг. XX ст. Тэорыя «аптымальных колераў» Г. Фрылінга і К. Аўэра. Уплыў актыўных (чырвонага, жоўтага) і пасіўных (сіняга, зялёнага) колераў на чалавека. Колер у ансамблі экспазіцыі. Колер з высокай адлюстроўваючай здольнасцю. Асацыятыўнасць колеру. Аптымальнае каляровае асяроддзе. Каляровы кантраст у экспазіцыі.

Свет як кампанент экспазіцыйнага ансамбля. Музейная спецыфіка і выкарыстанне асвятлення ў музейнай экспазіцыі. Асвятленне экспанатаў у вітрынах, на сценах, подыумах і г.д.

Тэарэтычныя даследаванні Я. К. Кралау, Г. М. Кнорынга аб сістэмах асвятлення. Сістэмы асвятлення: натуральнае, штучнае і камбінаванае. Праблема асвятлення музея і сувязь з архітэктурай музейнага будынка.

Святлоўстойлівасць музейных экспанатаў. Агульнае і мясцовае асвятленне. Абарона музейных прадметаў ад шкодных ультрафіялетавых прамянёў.

### *Тэма 15. Абсталяванне ў сістэме экспазіцыйнага ансамбля*

Экспазіцыйнае абсталяванне як сродак арганізацыі прасторы, кампазіцыйных рашэнняў. Форма і стыль абсталявання. Варыянты абсталявання: стылізаванае, кантраснае, нейтральнае. Стэнды і вітрыны. Абсталяванне для экспазіцый і выстаў па сучасным перыядзе. Утылітарна-тэхнічныя функцыі абсталявання па ахове музейных экспанатаў. Роля абсталявання ў фарміраванні вобліку інтэр'ера экспазіцыйнага зала.

## Раздзел V. Арганізацыя і асноўныя этапы мастацкага праектавання музейных экспазіцый

### *Тэма 16. Генеральнае рашэнне музейнай экспазіцыі*

Асноўныя задачы генеральнага рашэння музейнай экспазіцыі. Асноўныя мастацкія прынцыпы пабудовы экспазіцыі. Размяшчэнне асноўных тэм па залах і тэрыторыі музея. Аб'ёмна-прасторавае рашэнне экспазіцыі музея. Прынцыпы асвятлення і каляровага рашэння экспазіцыі. Пытанні афармлення інтэр'ера і вырабу абсталявання. Размяшчэнне асноўных вядучых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экспанатаў. Варыянты экспазіцыйных маршрутаў. План тэрыторыі музея. Адкрытая экспазіцыя музея.

### *Тэма 17. Эскізны праект музейнай экспазіцыі*

Распрацоўка эскізнага праекта. Эскізны праект у графічным варыянце. Размеркаванне плошчаў для тэматычных раздзелаў і расстаноўка экспазіцыйнага абсталявання ў эскізным праекце. Экспанат як аснова экспазіцыі. Прыёмы размяшчэння вядучых экспанатаў. Метады іх паказу.

Экспазіцыйныя паясы. Канчатковае аб'ёмна-прасторавае і каляровае рашэнне экспазіцыі. Перспектывы залаў у колеры. Развёрткі сцен і выдзяленне экспазіцыйных комплексаў. Фрагменты і разрэзы экспазіцыйных залаў. Пытанні асвятлення залаў, экспазіцый і асобных экспанатаў. Размяшчэнне аўдыявізуальных і тэхнічных сродкаў і іх адлюстраванне ў эскізным праекце. Канструкцыі абсталявання і аб'ёмныя дэкаратыўныя элементы.

### *Тэма 18. Тэхнарабочае праектаванне. Арганізацыя мантажу экспазіцыі*

Мантажныя аркушы. Фіксацыя месца экспанатаў, тэкстаў і тэхнічных сродкаў. Тэхнарабочая дакументацыя. Рабочыя чарцяжы. Эскізы макетаў, дыярам, навукова-дапаможнага матэрыялу, жывапісных пано, манументальна-дэкаратыўнага афармлення музея. Арганізацыя мастацка-выканаўчых работ.

Графічная частка экспазіцыі. Шрыфтавыя работы. Памеры, тып, форма, колер і размяшчэнне тэкстаў.

Пракладка камунікацыйных ліній для асвятлення і замацавання экспанатаў. Рамонтна-будаўнічыя і аддзелачныя работы ў экспазіцыйных памяшканнях. Арганізацыя мантажу экспазіцыі. Падрыхтоўка неабходных матэрыялаў для вернісажу і рэкламы экспазіцыі. Рэкламныя выданні. Змест, мастацкае афармленне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Аб музеях* і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь ад 12 снеж. 2005 г. № 70-З // Нац. прававы інтэрнэт-партал Рэсп. Беларусь. – [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://pravo.by.

2. *Беларускія* музеі. Гісторыя. Хроніка. Сучаснасць / уклад. А. М. Калбаска ; Беларус. ін-т праблем культуры. – Мінск : БелІПК, 1998. – 130 с. – (Музейныя сшыткі : навук.-метад. зб. ; вып. 4).

3. *Беларускі* дзяржаўны музей народнага дойлідства і побыту // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск : БелЭн, 1993. – Т. 1. – С. 428–429.

4. *Заслаўскі* гісторыка-культурны запаведнік // Беларуская энцыклапедыя. – Мінск : БелЭн, 1998. – Т. 6. – С. 546.

5. *Декросс, А.* Постоянные экспозиции в Городе науки и техники Ла Виллет: Эксплора / А. Декросс, Ж. Ландри, Ж. П. Натали // Museeum : Ежекварт. журн. ЮНЕСКО. – 1987. – № 3/4. – С. 49–66.

6. *Изучение* музейных коллекций : сб. науч. тр. / сост. и науч. ред. У. М. Полякова. – М. : НИИ культуры, 1974. – Вып. 21. – 134 с.

7. *Інструкцыя* аб парадку камплектавання, уліку, навуковай апрацоўцы, захаванні і выкарыстанні прадметаў Музейнага фонду РБ. – Мінск : Б.в., 1997. – 67 с.

8. *Искусство* музейной экспозиции: современные тенденции архитектурно-художественных решений / отв. ред. А. Д. Тимрот. – М. : [б. и.], 1982. – 119 с. : рис. – (Сборник научных трудов / НИИ культуры; № 112).

9. *Музееведение.* Музеи исторического профиля : учеб. пособие для студентов вузов, обучающихся по специальности «история» / под ред. К. Г. Левыкина, В. Хербста. – М. : Высш. шк., 1988. – С. 195–269.

10. *Музееведение.* Вопросы научного содержания экспозиций краеведческих музеев / отв. ред. С. А. Каспаринская. – М. : [б. и.], 1987. – 165 с. : табл. – (Сборник научных трудов / Науч.-исслед. ин-т культуры).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. *Музейныя* сшыткі. Навуковае праектаванне музейных экспазіцый : навук.-метад. зб. – Ч. 1. – Мінск : БелІПК, 1996. – С. 6–14.

12. *Музееведение*. На пути к музею XXI века : музейная экспозиция : Теория и практика. Искусство экспозиции. Новые сценарии и концепции / отв. ред.-сост. М. Т. Майстровская ; М-во культуры Рос. Федерации, Рос. акад. наук. – М. : РИК, 1997. – 365 с.

13. *Музееведение*. Искусство музейной экспозиции и техническое оснащение музеев / науч. ред. А. Д. Тимрот. – М. : [б. и.], 1985. – 131 с. : рис. – (Сборник научных трудов / Науч.-исслед. ин- т культуры ; № 139).

14. *Музей* в современном мире : традиционализм и новаторство / сост. Л. И. Скрипкина. – М. : ГИМ, 1999. – 198 с. – (Труды Государственного исторического музея ; вып. 104).

15. *Музейные* фонды и экспозиции в научно-образовательном процессе: материалы Всерос. науч. конф., Томск, 18–20 марта 2002 г. / Том. гос. ун-т, Межрегион. ин-т обществ. наук, Том. обл. краевед. Музей ; отв. ред. Э. И. Черняк. – Томск : Изд-во Том. ун-та, 2002. – 418 с.

16. *Нясвіжскі* палацава-паркавы комплекс // Беларуская энцыклапедыя. – Мінск : БелЭн, 2000. – Т. 11. – С. 418.

17. *Пелевин, Ю. А.* Художественная экспозиция : (принципы и методы построения) / Ю. А. Пелевин ; Рос. ин-т переподгот. работников искусства, культуры и туризма, каф. музейного дела. – М. : [б. и.], 1992. – 49 с.

18. *Полацкі* гісторыка-культурны запаведнік // Беларуская энцыклапедыя. – Мінск : БелЭн, 2001. – Т. 12. – С. 462.

19. *Поляков, Т. П.* Как делать музей? (О методах проектирования музейной экспозиции) : учеб. пособие для студентов и аспирантов, обучающихся по специальности «музееведение» / Т. П. Поляков. – М. : Рос. ин-т культурологии, 1996. – 253 с.

20. *Сапанжа, О. С.* Взаимодействие музея и посетителя : вопросы классификации / О. С. Сапанжа // Музей-зритель. XXI век : материалы Междунар. конф. к 80-летию науч.-просвет. отдела. – СПб. : Изд-во Гос. Эрмитажа, 2006. – С. 108–115.

21. *Сапанжа, О. С.* Музейная коммуникация: между теорией и практикой / О. С. Сапанжа // Художественное образование: содержание и методы обучения : сб. науч. тр. профессорско-преподавательского состава и аспирантов факультета изобра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зительного искусства РГПУ им. А. И. Герцена. – СПб. : Ризограф НОУ «Экспресс», 2008. – Вып. 3. – С. 6–9

22. *Поляков, Т. П.* Мифология музейного проектирования, или «Как делать музей?» : учеб. пособие для студентов и аспирантов, обучающихся по специальности «музееведение» / Т. П. Поляков. – М. : Рос. ин-т культурологии, 2003. – 454 с.

23. *Основы* музееведения : учеб. пособие / отв. ред. Э. А. Шулепова. – М. : Едиториал УРСС, 2005. – 501 с.

24. *Чеснокова, М. Н.* Эволюция музейной экспозиции как знаковой системы : дисс. канд. культурологии : 24.00.03 / М. Н. Чеснокова. – СПб., 2010. – 163 с.

25. *Шляхтина, Л. М.* Основы музейного дела : теория и практика : учеб. пособие для студентов пед. и гуманитар. вузов / Л. М. Шляхтина. – М. : Высш. шк., 2005. – 182 с.

26. *Шмелев, В. Г.* Музеи под открытым небом: очерки возникновения и развития / В. Г. Шмелев. – Киев : Наукова думка, 1983. – 119 с.

27. *Юренева, Т. Ю.* Музееведение : учебник для высшей школы / Т. Ю. Юренева. – М. : Акад. проект, 2003. – 558 с.

### *Дадатковая*

1. *Вопросы* совершенствования музейных экспозиций: (Отделы истории СССР дооктябрьского периода) / ред.-сост. С. А. Каспаринская. – М., 1981. – 162 с. : ил. – (Труды / Науч.-исслед. ин-т культуры, 103).

2. *Дукельский, В.* Музейные коллекции и предметный мир культуры / В. Дукельский // Некоторые проблемы исследования современной культуры : сб. науч. тр. – М. : НИИ культуры, 1986. – С. 26–34.

3. *Дукельский, В. Ю.* Памятники истории и культуры в системе музейной деятельности / В. Ю. Дукельский // Памятниковедение: теория, методология, практика : сб. науч. тр. – М. : НИИ культуры, 1986. – С. 89–107.

4. *Киселев, В. В.* Классификация оборудования экспозиций и фондохранилищ музеев : сб. науч. тр. / В. В. Киселев // Музееведение. Искусство музейной экспозиции и техническое оснащение музеев / науч. ред. А. Д. Тимрот. – М. : НИИ культуры, 1985. – Вып. 139. – С. 48–80.

5. *Литвинов, В. В.* Практика современной экспозиции / В. В. Литвинов. – М. : Плакат, 1989. – 191 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*6. Методические* рекомендации по разработке научной концепции стационарной экспозиции музея / Всесоюз. о-во «Знание», Политехн. музей ; сост.: Р. А. Шубенкина, М. А. Нурок ; отв. ред. Г. Г. Григорян. – М.: [б. и.], 1988. – 10 с., включ. обл.

*7. Михайловская, А. И.* Музейная экспозиция : (организация и техника) / под ред. Ф. Н. Петрова, К. Г. Митяева ; М-во культуры РСФСР, Науч.-исслед. ин-т музееведения. – 2-е изд., доп. – М. : Сов. Россия, 1964. – 517 с.

*8. Музейное* дело в СССР : актуальные проблемы архит.-худож. проектирования экспозиций ист. и краевед. музеев : сб. науч. тр. / М-во культуры СССР, Центр. музей революции СССР. – М. : [б. и.], 1983. – 118 с.

*9. Музееведение.* Вопросы научного содержания экспозиций краеведческих музеев / отв. ред. С. А. Каспаринская. – М., 1987. – 165 с. – (Сборник научных трудов / Науч.-исслед. ин- т культуры).

*10. Музееведение*. Естественно-научные музеи : (теория и практика работы) / отв. ред. И. В. Иксанова. – М. : [б. и.], 1984. – 145 с. – (Сборник научных трудов / Науч.-исслед. ин- т культуры ; № 128).

*11. Музей* и современность : проблемы экспозиц. работы музеев на соврем. этапе / отв. ред. Ф. Л. Курлат. – М., 1984. – 141 с. – (Сборник научных трудов / Науч.-исслед. ин-т культуры ; № 132).

*12. Рекомендации* по проектированию искусственного освещения музеев. – М. : Б. и., 1973. – 67 с.

*13. Проблемы* экспозиционной и фондовой работы / сост. Л. М. Костюхина. – М. : ГИМ, 1987. – 159 с. – (Труды Гос. ист. музея ; вып. 65).

*14. Традиции* и поиск : проблемы новой экспозиции ГИМ по истории периода капитализма / отв. ред. Л. П. Минарик. – М. : ГИМ, 1991. – 135 с. – (Труды Гос. ист. музея; вып. 77).

*15. Шмит, Ф. И.* Исторические, этнографические, художественные музеи. Очерки истории и теории музейного дела / Ф. И. Шмит. – Харьков: Свет, 1919. – С. 1 – 28.

*16. Шмит, Ф. И.* Музейное дело. Вопросы экспозиции / Ф. И. Шмит. – Л. : ACADEVIA, 1929. – 245 с.

*17. Уилл, Л.* Музеи как информационные центры // Museum : Ежекварт. журн. ЮНЕСКО. – 1994. – № 3. – С. 20–29.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**НАВУКОВА-ЭКСПАЗІЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МУЗЕЯ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для напрамку спецыяльнасці
1-23 01 12-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай
спадчыны (музеязнаўства) і напрамку спецыяльнасці
1-23 01 12-04 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай
спадчыны (культурная спадчына і турызм)*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2014. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,11. Ул.-выд. арк. 0,72. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ